DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов
Республики Беларусь 28 декабря 2007 г. N 8/17815

**ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**14 снежня 2007 г. N 50**

# АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ПАЛАЖЭННЯ АБ МЕРАХ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ УКАЗА ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД 18 КАСТРЫЧНІКА 2007 Г. N 527

На падставе пункта 9 Палажэння аб Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 2001 г. N 1558 "Вопросы Министерства культуры Республики Беларусь", Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

Зацвердзіць прыкладзенае Палажэнне аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2007 г. N 527.

Міністр У.Ф.МАТВЕЙЧУК

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Брэсцкага абласнога
выканаўчага камітэта
К.А.Сумар
13.12.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Віцебскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.П.Андрэйчанка
14.12.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
А.С.Якабсон
13.12.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
У.Я.Саўчанка
13.12.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Магілёўскага абласнога
выканаўчага камітэта
Б.В.Батура
14.12.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага абласнога
выканаўчага камітэта
Л.Ф.Крупец
14.12.2007

УЗГОДНЕНА
Старшыня
Мінскага гарадскога
выканаўчага камітэта
М.Я.Паўлаў
14.12.2007

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
14.12.2007 N 50

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

# ПАЛАЖЭННЕ АБ МЕРАХ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ УКАЗА ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АД 18 КАСТРЫЧНІКА 2007 Г. N 527

1. Дадзенае Палажэнне ўстанаўлівае парадак узаемадзеяння Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (далей - Міністэрства культуры) і адпаведных структурных падраздзяленняў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў пры выкананні метадычнага, арганізацыйнага садзейнічання і кантролю за функцыянальным выкарыстаннем гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей - каштоўнасць) і зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (далей - зоны аховы), своечасовасцю і паўнатой ажыццяўлення адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на каштоўнасць або зоны аховы (далей - адлічэнні), або выплаты кампенсацый за шкоду, што прычыняецца каштоўнасцям або зонам аховы ў выніку такой дзейнасці (далей - кампенсацыя).

2. У дадзеным Палажэнні выкарыстоўваюцца тэрміны і вызначэнні ў значэннях, устаноўленых Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 кастрычніка 2007 г. N 527 "Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2007 г., N 252, 1/9038).

3. Устаноўленыя заканадаўствам адлічэнні выплачваюцца за названую ў пункце 1 дадзенага Палажэння прадпрымальніцкую дзейнасць юрыдычнымі і (або) фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі (далей - карыстальнікі), якія ажыццяўляюць такую дзейнасць на падставе заключанага з уласнікам каштоўнасці (далей - уласнік) пагаднення ў пісьмовай форме.

4. Міністэрства культуры арганізуе кантроль за функцыянальным выкарыстаннем каштоўнасцей і зон аховы, а мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы забяспечваюць такі кантроль.

5. Узаемадзеянне Міністэрства культуры і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў ажыццяўляецца шляхам абмену (у тым ліку і ў электронным выглядзе) дакументамі (інфармацыяй), якія неабходны для ажыццяўлення кантролю за функцыянальным выкарыстаннем каштоўнасцей і зон аховы, шляхам праверкі выканання заканадаўства ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны на падставе сумесна складзенага гадавога плана, фарміравання рэестра (спіса) карыстальнікаў, якія ажыццяўляюць адлічэнні.

6. Па рашэнню мясцовага выканаўчага і распарадчага органа кантроль за функцыянальным выкарыстаннем каштоўнасцей і (або) зон аховы ажыццяўляюць адпаведныя падраздзяленні дадзенага мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, на тэрыторыі якога размешчаны гэтыя каштоўнасці або зоны аховы.

Абавязковым з'яўляецца ўдзел у ажыццяўленні названага кантролю спецыяліста, які вызначаны мясцовым выканаўчым і распарадчым органам адказным за ахову гісторыка-культурнай спадчыны (далей - спецыяліст).

7. Уласнік каштоўнасці або тэрыторыі ў зонах аховы ў выпадку заключэння ім пагаднення ў пісьмовай форме з карыстальнікам на выкарыстанне названай каштоўнасці (яе частак) або тэрыторыі ў зонах аховы ў мэтах ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці згодна з пунктам 1 артыкула 47 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь" (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., N 9, 2/1195) не пазней за 10 дзён з моманту падпісання бакамі азначанага пагаднення абавязаны праінфармаваць аб гэтым мясцовы выканаўчы і распарадчы орган, на тэрыторыі якога знаходзяцца каштоўнасць або зоны аховы.

8. З мэтай ажыццяўлення кантролю за функцыянальным выкарыстаннем каштоўнасцей і (або) зон аховы спецыяліст вядзе спіс карыстальнікаў на падставе інфармацыі, вызначанай пунктам 7 дадзенага Палажэння, заносіць атрыманыя ад уласнікаў каштоўнасці або тэрыторый у зонах аховы звесткі ва ўліковыя дакументы на гісторыка-культурныя каштоўнасці.

9. Інфармацыю аб неабходнасці ажыццяўлення адлічэнняў, іх перыядычнасці і памеры мясцовы выканаўчы і распарадчы орган даводзіць да ведама карыстальніка каштоўнасці і (або) тэрыторыі ў зонах аховы, якія знаходзяцца на тэрыторыі гэтага мясцовага органа.

10. Спіс карыстальнікаў, якія ажыццяўляюць адлічэнні, мясцовы выканаўчы і распарадчы орган у тэрмін да 30 снежня года, на працягу якога дзейнічала пісьмовае пагадненне паміж уласнікам і карыстальнікам, накіроўвае ў Міністэрства культуры, якое забяспечвае кантроль за своечасовасцю і паўнатой паступлення адлічэнняў на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры, падрыхтоўку матэрыялаў адносна выкарыстання па рэгіёнах атрыманых сродкаў для іх разгляду на пасяджэнні савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (далей - фонд).

DISCLAIMER: As Member States provide national legislations, hyperlinks and explanatory notes (if any), UNESCO does not guarantee their accuracy, nor their up-dating on this web site, and is not liable for any incorrect information. COPYRIGHT: All rights reserved.This information may be used only for research, educational, legal and non-commercial purposes, with acknowledgement of UNESCO Cultural Heritage Laws Database as the source (© UNESCO).

11. Міністэрства культуры інфармуе ў пісьмовай форме (у электронным выглядзе) адпаведныя мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы аб факце ажыццяўлення карыстальнікамі і (або) уласнікамі адлічэнняў і выплаты кампенсацый у фонд або аб несвоечасовасці правядзення такіх плацяжоў і налічэнні пені за пратэрмінаванне. Паведамляе зацікаўленым мясцовым выканаўчым і распарадчым органам аб прынятых рашэннях па выкарыстанню гэтых сродкаў і падрыхтоўцы неабходных дакументаў для ажыццяўлення такога выкарыстання, спрыяе іх афармленню ў фінансавых органах Рэспублікі Беларусь.

12. Кантроль за своечасовасцю і паўнатой унесеных сродкаў забяспечваецца Міністэрствам культуры на падстве інфармацыі, якая паступіла ад адпаведных структурных падраздзяленняў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў адносна карыстальнікаў і (або) уласнікаў, што павінны ажыццяўляць адлічэнні, а таксама з улікам аналізу выканання прадпісанняў, азначаных у пункце 13 дадзенага Палажэння.

13. Вызначаная заканадаўствам кампенсацыя ажыццяўляецца як уласнікамі, так і карыстальнікамі каштоўнасці і (або) тэрыторый у зонах аховы ў выпадку ўстанаўлення факту прычынення шкоды і на падставе прадпісання Міністэрства культуры, накіраванага суб'екту яе прычынення.

14. Копія прадпісання на адрас уласніка або карыстальніка, якім устанаўліваецца абавязак па выплаце кампенсацыі, яе памер і перыядычнасць выплаты, Міністэрствам культуры адначасова накіроўваецца адпаведнаму структурнаму падраздзяленню мясцовага выканаўчага і распарадчага органа.

UNESCO Cultural Heritage Laws Database (Copyright and Disclaimer apply)